ПАЛАЖЭННЕ

аб абласной алімпіядзе

па музычна-тэарэтычных

дысцыплінах

1. Арганізатарамі абласной алімпіяды па музычна-тэарэтычных дысцыплінах (далей – алімпіяды) з’яўляюцца Брэсцкі абласны выканаўчы камітэт і ўстанова адукацыі “Брэсцкі дзяржаўны музычны каледж імя Рыгора Шырмы”.

2.0 Мэтай алімпіяды з'яўляецца выяўленне, падтрымка і заахвочванне таленавітых навучэнцаў Брэсцкай вобласці ў сферы музычнай адукацыі, стымуляванне іх асобаснага росту.

2.1. Задачы алімпіяды:

павышэнне якасці падрыхтоўкі вучняў па прадметах музычна-тэарэтычнага цыкла;

стымуляванне цікавасці да вывучэння музычна-тэарэтычных дысцыплін;

пашырэнне кругагляду вучняў, далучэнне іх да айчыннага і сусветнай культурнай спадчыны;

актывізацыя прафарыентацыйнай работы;

развіццё форм творчага супрацоўніцтва ў сістэме ДШМ - УССА;

стымуляванне прафесійнага росту настаўнікаў музычна-тэарэтычных дысцыплін.

3. У алімпіядзе могуць браць удзел навучэнцы ДШМ, ДМШ і ўстаноў адукацыі сістэмы Міністэрства адукацыі (далей – удзельнікі алімпіяды).

4. Для непасрэднага кіравання правядзеннем алімпіяды ствараецца арганізацыйны камітэт (далей – аргкамітэт).

5. Аргкамітэт:

ажыццяўляе кіраванне падрыхтоўкай і правядзеннем алімпіяды;

разглядае і зацвярджае склад журы алімпіяды;

узаемадзейнічае з зацікаўленымі суб’ектамі культурнай дзейнасці і іншымі арганізацыямі па пытаннях падрыхтоўкі, правядзення і асвятлення алімпіяды ў сродках масавай інфармацыі;

вырашае іншыя пытанні, якія ўзнікаюць у ходзе падрыхтоўкі і правядзення алімпіяды.

6. Пасяджэнні аргкамітэту лічацца правамоцнымі, калі ў іх бярэ ўдзел не менш за дзве трэці яго складу. Рашэнні аргкамітэту прымаюцца адкрытым галасаваннем і лічацца прынятымі, калі за іх прагаласавала больш за палову членаў аргкамітэту з прысутных на пасяджэнні.

Рашэнне аргкамітэту афармляецца пратаколам, які падпісвае старшыня аргкамітэту.

7. Умовы правядзення алімпіяды.

7.1. Алімпіяда праводзіцца па дзвюх узроставых групах:

I група - навучэнцы 7 класа сямігадовага тэрміну навучання ДШМ (ДМШ, ДМШМ) і 9 класа сярэдніх школ (гімназій) з музычна-эстэтычным напрамкам.

II група - навучэнцы 5 класа пяцігадовага тэрміну навучання ДШМ (ДМШ, ДМШМ).

Да ўдзелу ў алімпіядзе дапускаюцца таксама навучэнцы перадвыпускных класаў (6 па 7/г. і 4 па 5/г.); яны ўдзельнічаюць у алімпіядзе на агульных умовах.

7.2. Для ўдзелу ў алімпіядзе асобна ўдзельнік алімпіяды альбо ўстанова адукацыі, у якой ён навучаецца, накіроўвае наступныя матэрыялы:

запоўненую электронную форму заяўкі;

копію дакумента, які сведчыць асобу (пашпарт або пасведчанне аб нараджэнні);

7.3. Заяўкі на ўдзел у алімпіядзе прымаюцца да 14 сакавіка 2022 года (уключна). Форма заяўкі прыкладаецца. Усе матэрыялы прадастаўляюцца ў электронным выглядзе як дадатак да формы заяўкі і дасылаюцца на электронную пошту muzolimp.brest@gmail.com Пытанні наконт заяўкі і ўдзелу ў алімпіядзе па кантактных тэлефонах:
(8 0162)570360 Святлана Вячаславаўна Макарчук, метадыст каледжа, старшыня цыклавой камісіі “Гісторыя музыкі”;

(+37529) 5605105 Ганна Уладзіміраўна Манько, старшыня цыклавой камісіі «Тэорыя музыкі».

7.4. У выпадку хваробы кандыдата па рашэнні адміністрацыі накіроўваючага боку можа быць праведзена замена ўдзельніка, пра што паведамляецца ў аргкамітэт алімпіяды не менш, чым за 2 каляндарныя дні да пачатку яе правядзення (не пазней за 10.00 17 сакавіка 2022 года).

7.5. Алімпіяда праводзіцца ў адзін тур у Брэсцкім музычным каледжы 19 сакавіка 2022 года.

Рэгламент правядзення:

рэгістрацыя ўдзельнікаў з 9.00 да 9.40 (фае каледжа);

адкрыццё алімпіяды з 9.40 да 10.00 (камерная зала, першы паверх);

выкананне конкурсных заданняў з 10.00 (па аўдыторыях).

8. Для прафесійнай ацэнкі ўдзельнікаў аргкамітэт зацвярджае склад членаў журы алімпіяды (далей– журы) у колькасці не больш за пяць чалавек у кожнай катэгорыі.

9. У склад журы ўключаюцца выкладчыкі цыклавых камісій "Тэорыя музыкі» і “Гісторыя музыкі” УА «Брэсцкі дзяржаўны музычны каледж імя Рыгора Шырмы».

10. Журы:

ацэньвае прафесійны і творчы ўзровень удзельнікаў алімпіяды;

афармляе пратаколы вынікаў галасавання на алімпіядзе;

выбірае прызёраў і дыпламантаў алімпіяды, уладальнікаў спецыяльных прэмій і ўзнагарод у кожнай з катэгорый і ўзроставых груп алімпіяды і прадстаўляе іх спіс у аргкамітэт для ўзнагароджання;

інфармуе ўдзельнікаў алімпіяды аб выніках іх удзелу ў алімпіядзе.

11. Сярэдні бал па дысцыплінах «Сальфеджыа» і «Музычная літаратура» разлічваецца асобна матэматычным складаннем адзнак па ўсіх формах работы дадзенай дысцыпліны;

Агульны бал вылічваецца матэматычным складаннем сярэдніх балаў, якія ўдзельнік атрымаў па дзвюх дысцыплінах - «Сальфеджыа» і «Музычнай літаратуры».

12. Размеркаванне прызавых месцаў і спецыяльных узнагарод адбываецца шляхам галасавання ўсіх членаў журы.

У выпадку, калі ў алімпіядзе прымае ўдзел вучань альбо сваяк члена журы, дадзены член журы абавязаны адмовіцца ад судзейства ў той узроставай групе, дзе бярэ ўдзел яго вучань (сваяк).

13. Рашэнні журы прымаюцца на пасяджэннях і афармляюцца пратаколамі, якія падпісваюць члены журы. Журы правамоцна прымаць рашэнне, калі на пасяджэнні прысутнічае не менш за дзве трэці ад яго поўнага складу. Рашэнне лічыцца прынятым, калі за яго прагаласавала больш за палову прысутных на пасяджэнні членаў журы. У выпадку роўнасці галасоў меркаванне старшыні журы з'яўляецца вырашальным. Усе рашэнні журы канчатковыя і не могуць быць аспрэчаны.

13.1. Журы мае права: дзяліць, прысуджаць і не прысуджаць прызавыя месцы; узнагароджваць удзельнікаў спецыяльнымі граматамі (прызамі). Узнагародныя матэрыялы будуць накіроўвацца на электронную пошту ДШМ ўсім удзельнікам. Калі нашага ліста там не апынецца, звярніцеся ў аргкамітэт па адрасе muzolimp.brest@gmail.com

13.2. Журы пакідае за сабой права ўзнагародзіць спецыяльнымі граматамі ўдзельнікаў за якаснае выкананне асобных форм работы.

14. Пераможцы алімпіяды ва ўсіх узроставых групах кожнай катэгорыі атрымліваюць дыпломы I, II і III ступені з прысваеннем звання Лаўрэата.

14.1. Настаўнікі пераможцаў алімпіяды ўзнагароджваюцца дыпломамі «За педагагічнае майстэрства».

14.2. Удзельнікі алімпіяды, якія паказалі добрыя, але недастатковыя для дасягнення прызавых месцаў вынікі, атрымліваюць ганаровыя граматы.

15. Праезд, харчаванне і размяшчэнне ўдзельніка і яго суправаджаючых асоб ажыццяўляецца за кошт камандзіруючага боку.

16. Кантакты алімпіяды:

Электронная пошта: muzolimp.brest@gmail.com
Тэлефоны: +375162570360, +375295605105, +375297550959. Вэб-сайт музычнага каледжа: mus.brest.by

Фізічны адрас:

Установа адукацыі "Брэсцкі дзяржаўны музычны каледж імя Рыгора Шырмы",
вул. Гогаля, 7, 224030, г. Брэст.